395636

Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністрації: Вільня, Віленская вул., № 29

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г. 2 р. 50 к. на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес —25 к. За граніцай: на 1 г — 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес. – 1 р. Пераменa адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна таксамо падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад

Год IX. 9 Студня 1914 г. № 2

**Усім, хто дагэтуль неаднавіў падпіскі, далей ужо газэта ня будзе высылацца.**

## Чаму нам не даюць жыць.

Даўнымі часамі сіла дзержавы і нації апіралася на ваенным стане (сословіі), стан гэты лічыўся „лепшымі людзьмі“, ён кіраваў справамі дзержавы і доляй народу. Шырокіе народные массы былі паняволены гэтым станам і ні ў гасударственных, ні ў грамадзянскіх справах голасу ня мелі. Хто патрапіў скланіць у свой бок «лепшых людзей», значэ аружную і экономічную сілу (бо адно з другім ішло ў пары) на свой бок, ці то ласкай, ці то сілай, той валадзеў старонкай Гэтак было даўней. Але, калі цэлы сьвет прызнаў і за маламожнымі людзьмі правы чэлавека і грамадзяніна, мала памалу выключнае панаваньне вышэйшых станоў руйнавалося і народ пачынаў набіраць што раз большаго значэньня. Там, дзе вышэйшые і ніжэйшые станы былі націанальна аднолітны, справа гэта зводзілася у канцы канцоў толькі да экономічнаго змаганьня паміж многаможнымі і маламожнымі, пры адных і тыхжэ націанальных ідэалах. Гэтак зложылося ва ўсіх старонках дзе утрымалася націанальная дзержаўнасць, або дзе гэта дзержаўнасць нідаўна была раскідана. Затое у такіх старонках, як наша, дзе гасударственнасць была заўсёды націанальна чужая народу і народ перахадзіў ад аднэй гасударственнасьці да другой, там вышэйшые станы адарваліся ад народу, а у народнай массе зазвычай націанальнай сьвядомасьці не бывае і народ прэдстаўляе сабой сыры матэрьял, каторы наслаіўшаяся за доўгі час інтэлігенція, дзержаўная і недзержаўная, кожная стараецца перэцягнуць на свой бок народ і упадобіць сабе яго. Дзеецца гэта с тэй прычыны, што як даўней вышэйшые станы, так цяпер народ—сіла. Хто мае на сваей старане народ, той папраўдзі мае у сваіх руках сілу. Вось чаму у нас на Беларусі ідзе такая заўзятая вайна за наш народ паміж палякамі і расейцамі, і чаму тые абедзьві нації так праціўны націанальнаму вызваленьню нашаго народу. І датуль пакуль будзе у народзе несьвядомая, цёмная масса, каторую лёгка абаламуціць і перэцягнуць на той, ці іншы бок, датуль наш край будзе арэнай націанальнаго змаганьня і націанальных сварак. Падзе гэтае зьеданьне адны адных толькі тады, калі народная масса усьвядоміцца націанальна

**Власт.**

## У сваю абарону.

Дачэкаўся і я, дзякаваць Богу, гонару, што на маю худую асобу звярнула увагу ясна вяльможная газэта „Kurjer Litewski“. Сталося гэта с прычыны маей мізэрнай пробы установіць, які павінен быць погляд народу селянскаго на гэрбы і прывілеі, каторые пісала сабе шляхта „ку памножэньню сваіх дастаткоў і збыткоў, працай нашых дзядоў і прадзедоў. Адным словам сталося гэта с прычыны стацьці маей аб 500-летняй гадаўшчыне Городэльскай уніі.

Найболей аўтора безіменнай стацьці абурыў мой сказ, што не вяліку учыніла ласку польская шляхта даючы гэрбы і прывілеі нават нашым тагочасным баярам, бо яны і бяз гэтаго ня счэзлі-б а мабыць асталісяб такімі самымі панамі ды толькі дзержаліся-бы сваей нації..

І вось «Kurjer Lit.» каб ешчэ болей падбіць сваіх аднадумцоў проці ненавістнаго для іх жаданьня беларусоў—колішніх мужыкоў прыгонных—праўдзівай роўнасьці, праз культурнае адраджэньне ўсяго народу. абвешчае:

„Нябудземо ўступаць у палеміку з Ягомасьцем Верэшчакай, нас можэ цікавіць толькі пытаньня ці ён сам і людзі зродные яму па духу доўга ешчэ будуць здаволівацца падобнымі неглыбокімі поглядамі. Сам аўтор, здаецца, гэтак здаволен сваім скромным знаньнем гісторыі каторую пачэрпнуў з Іловайскаго, ці мо з гісторыі Беларусі выданай «Нашай Нівай», што ўжо мабыць не пачувае патрэбы далейшаго развіцьця, дык і наперад ня пойдзе Не сумневаемся затое, што ўжо сын Ягомасьці Верэшчакі не здаволіцца тэй меркай знаньня і захочэ глыбей заглянуць, захочэ дабыць шырэйшы пагляд як на цяперышчыну, так на мінуўшчыну і будучыну. А калі гэтак станецца, то не паўторыць ужо за бацькам што, каб дзержава літоўская не зрабіла уніі с Польшчай, то баяры літоўскіе і беларускіе асталіся-б па ся гоняшні дзень баярамі літоўскімі і беларускімі“.

Выходзіць, бытцым нашы баяры, так ці гэтак не маглі астацца пры сваім народзе, а павінны былі адступіцца ад яго, але у другі які бок, мабыць, думае аўтор, у Маскоўскі. Ну ніхай і гэтак. Ці ня ўсё роўна, кім бы яны сталіся? Нам важэн факт, што яны *не з намі, а проці нас.*

Само сабой, не ўступаючы ў палеміку с „Kur. Lit.“ а дзеля ведама сваіх чытачоў беларусоў, я павінен адмеціць, што я узгадаваўся не на слаўным Іловайскім, а на такім цэненым народнымі дэмократамі пану Горжковскім і хаўрузіі. І як Іловайскі і ўвесь абрусіцельны аппарат не зьеднаў расейцам прыхільнікоў с паміж палякоў, так сама жывасілам упхнёны беларусам польскі патрыотызм хутка выветрываецца; беларус пачынае шукаць *сваей праўды*, і нельга сказаць, каб быў дужа ўдзячён затое, што карабацілі яго душу, калі дойдзе да самопазнаньня.

Гэтак і я, дзякуючы прыродна му дару крытыцызму, хутка ацьвярозіўся і саставіў сабе свой по гляд на гэрбы і прывілеі.

На Городэльскім зьездзі даваліся прывілеі не для ўсіх баяр беларускіх і літоўскіх, а толькі для тых, каторые куплялі іх цаной адступніцтва ад націанальных, гасударственных і інж ідэалоў. А дзеля таго, што у тые часы, калі не націанальная, то рэлігійная сьвядомасць жыла ешчэ у нашых баяроў, то траплялісе і такіе здарэньня, што адзін брат перэкідаўся шляхты. а другі асастаўся баярынам.

І.. меч „ўзімалі“ брат на брата.

Пасьля Городэльскай уніі пачалася вайна паміж шляхтай і баярамі. Хоць былі яны аднаго роду і племені, але іх бяздоннай пропасцю раздзялілі „прывілеі“ і першых другіе называлі „ляхамі“, чаго яны і самі, пры злажыўшыхся варунках не чураліся.

А як велася вайна гэта ніхай пасьведчуць лепшые, веры годные, польскіе гісторыкі.

І так знаходзім весткі у летапісца польскаго Кромэра пад 1426 годам і у летапісца Длугоша у Т. XI стр. 494, што Ягайла і яго сын Ўладыслаў адбіралі дзеля розных прычын землі ад *баяр* і аддавалі *шляхце.*

Морачэвскі у Т. 4 на стр. 168 пішэ: „Ляхі лацінскіе... край руйнавалі, а над князямі, баярамі і народам здзекаваліся“. (Lachowie ła-

## ПАД НОВЫ ГОД.

Ноч глухая, цемнь, завея,
Невідно і сьвету;
Толькі снег адзін бялее,
Ў іней лес адзеты.
Ні праезду, ні праходу,
Белы віхар ў полі,
Якбы тут дарожэк зроду
Небыло ніколі.
Свішчэ, плаче і галосіць
Завіруха злая;
Хаты, гумны.—ўсё заносіць,
Снегам задзімае.
Цісьне, крэпіць марозішчэ,
Ажно ліпнуць вочы...
Божэ! што тут за ігрышчэ
Ў полі сярод ночы!
А хто ходзіць полем-логам
Ў сьнезі па калені?
На пакуту, бачна Богам
Выгнаны дзве цені.
Чаго ж ходзяць, што шукаюць
Сярод цьмы—нягоды?
Гэта ходзюць, азіраюць
Божы сьвет Два Годы.
У старога за плечамі
Мех пусты трасецца,
Малады Год пад дарамі
Крэхкае і гнецца.
—Фу, мароз які пякучы,
Аж ў вачах іскрыцца!
Мерзнуць ногі праз анучы,
Нос гатоў зваліцца,—
Кажэ Новы Год старому:
„Ты спыні глум буры,
Мо пляцецца хто да дому
Да сваей пячуры.
Каб спаткаць мяне пачэсна,
Як вядзецца ў родзі:
З жонкай, з дзеткамі сумесна,
Ўсе ў ладу і згодзі.
Цяжка бедным і пахілым,
Зжалься над народам.
Я хачу быць для ўсіх мілым,
Добрым Новым Годам.—
Усьміхнуўся, ўзняўшы плечы,
Год Стары на гэта.
— Ты гаворыш не да рэчы,
Бо не знаеш сьвета.
Слухай, дружэ, і вучыся, —
Я ўжо госць на сьвеці
І хаджу от, трасучыся
Скора стану сьмеце.
Калі хочэш, ягомосьцю.
Ў памяці застацца.
Уешся людзям добра ў косьці,—
Хоць злым будзеш звацца.—
—Што пляцеш, пустапарожны!
Слухаць гэта нудна.
Добры год больш помніць кожны.—
—Гм! згадзіцца трудна.—
І заспорылі Два Годы,
Блазно і Старое:
Што хутчэй йдзе з рода ў роды,—
Добрае ці злое.
Сварка ў іх, як зьвёў ліхі іх,
Проста чуць ня б'юцца,
Ажно торбы і мяхі іх
І кіі трасуцца.
—Ша!—сказаў Стары:—даволі!
Ты да споркі ласы,
Не сайціся нам ніколі,
Запытаем Часы.—
І пашлі Вот лес прад імі
Ўстаў сьцяной магутнай,
Хвоі лапамі старымі
Б'юцца ў песьні смутнай,
І равуць дубы нястройна
Голымі сукамі,
Лес трасецца неспакойна,
Буйна галавамі.
Лес, чым далей, ўсё дзічэе,
Неба закрывае,
Нават вецер тут ня вее,
Пушча—страх якая!
—Станем тут!—Стары гаворыць,
Стаўшы на палянцы.
Ціха дрэвы штось гутораць,
Века выхаванцы;
Ціха ходзяць іх вярхушкі
Над палянкай с краю.
—Эй вы, Часы, Божы служкі!
Я вас выклікаю!—
Крыкнуў Год стары і—дзіва:
З-за камлёў дрэўляных,
Бы той дым, ўстаюць маўчліва
Рад цянёў незнаных.
Вышлі цені на палянку,
Ўсе пад нумэрамі,
Ў беласнежную катанку
Ўлезшы з галавамі.
На адных, як кроў, гарэлі
Знакі агневые,
А з другіх чуць чуць глядзелі
Буквы, як сьляпые.
Год Стары стаў перад імі
І сказаў ўладарна:
—Станця, Злые годы, з Злымі,
Хто ня згінуў марна!

cinscy.. kraj burzyli, a kniaziow, bojarów i lud przesladowali").

Прывлеі давалі ня толькі волю шляхце, але патуралі самавольства яе і самавольства гэтае расло і шырылося. Атрымаўшы шляхэцтва і прывілеі на гарады і сёлы, шляхта павінна была апісанае прывілеямі *узяць*. І яна выганяла даўных гаспадароў з іх дзедзін, а тые з недастаткоў пападалі у роспач і ўцекалі да татароў, каторых посьле вялі пустэшыць сваю бацькоўшчыну, з якой іх выгналі. (У летапісца Длугоша пад 1442 годам).

*Баяры* шукалі праўды проці *шляхты* на сэймах. У 1551 гаду Валынскіе і Падляскіе баяры прасілі сэйм учыніць канец „тым кгвалтам, наездам, забойствам, забіраньню зямель і грабежствам, каторые ся ад паноў—шляхты нам дзеюць“. Ды відаць не знаходзілі тэй праўды для сябе, бо паважаны польскі гісторык Лозінскі сьведчыць, што і далей: „Забівалі атрыта і скрыта, па дамох, па дарогах і рынках мескіх, на сэйміках і зьездах, на банкетах, а нават у судах, забівалі абы зашто і забівалі... безкарна (Prawem i lewem. Т. II).

Гэткіе дары прынесла унія баярам каторые хацелі устаяць проці прывілеёў. А што прынесла унія массам селянскага „люду“, нашым у простай лініі прашчурам?

А вось што:

Ужо у 1543 гаду, пасьля прыняцьця Жыгімонтам I статуту, селяніна (ва ўсей Польшчы) паставіла шляхта ў палажэньне безпраўнае, сам кароль ня мог умешывацца ў тое, як паны з мужыком пастулаюць. Аддадзены на ласку і не ласку пана ня меў ён у панскім судзе спогаду. Нічым неагранічэная самаволя гаспадара была для селяніна правам. Быў ён прыватнай панскай ўласнасьцю і пан мог зрабіць з ім усё, што яму падабалося.

Селянін ня меў права ўласнасьці: ўсё было ўласьнасьцю пана. Хата, ральля, жонка, дзеці, худоба, хатняя абстава — ўсё гэта лічылося панскае. Урадзіла ніва, то урадзіла пану. На тое толькі звярталі увагу, каб мужык не памёр, а хоць і памёр, то цэна грашавая яго была гэткая малая, што невяліка страта. Замучыў пан селяніна бязвінна, то плаціў кары 30 грывен, гэта значэ трэцьцю часць таго, што цяпер трэба заплаціць за быка. Але селянін быў заўсёды вінаваты, хіба што забіў яго ня свой пан, а чужы:

"Селяніну забаронена было вучыцца у школах. Адно было пазволена: піць гарэлку. І... „неперэставала памаўзлівая хцівасць людрускі (украінскі і беларускі) ціснуць“ (Balzkie t. II, str 295).

Гэтак было ва ўсей Польшчы; гэтак настало і ў нас.

Цяпер пытаньня: які маюць сымвол гэрбы і прывілеі для нас і для шляхты? І ці павінны мы радавацца с таго, што 500 гадоў таму назад на Городэльскім зьездзі надзялілі палякі нашых баяр гэрбамі і прывілеямі?

І ці не справядлівы мой сказ (каторы перэдруковываючы маю стацьцю у «Kur. Lit.» невядомы аўтор выкінуў), што ўсе гэтые прывілеі, ня торная сьцежка, а завалы ца праўдзіваго брацтва народоў.

**Юры Верэшчака.**

## Хто з намі, хто процiу нас.

Усё болей ды болей шырыцца і развіваецца беларускі культурна-нацыянальны рух. Прыбываюць новые сілы: паэты, пісьменнікі, грамадзкіе працоўнікі. Хутка расходзяцца у народзе беларускіе газэты, календары, кніжкі... праз што усё больш ды больш цяпер людзей, каторые ведаюць, што яны беларусы, што навучыўшыся добраго у чужых—свайго чурацца нельга.

Вось дзеля гэтаго на нас цяпер болей звертаюць увагі усе нашы суседзі, як прыяцелі, так і ворагі с паміж іх. Пакуль беларусы маўчалі і ніякай нацыянальнасьці у нас не было—датуль мала хто аб нас успамінаў. Возьмем хацябы аднашэньне да нас расейцоў. Тые людзі с паміж расейцоў, каторые, як цяпер уселякіе чорнасоценцы, казалі, што ніякіх перамен у жыцьці працуючаго народу ня трэба, што нібы-то яму і так добра жывецца, а усіх, як яны называюць, інородцоў трэба ціснуць, каб зрабіць іх расейцамі. Гэтые людзі рэдка калі спаміналі нас, мабыць думаючы, што і так ужо «заснула Беларусь, навекі заснула».

Вялікіе пісьменьнікі, паэты, публіцысты, грамадзянскіе дзейцы, вучоные—праславіўшые расейскае імя на ўвесь сьвет (пасярод іх прыхільнікоў чорнасоценства у тэй ці другой форме, так якбы і зусім не было),—ды іх прыхільнікі,—голасна кажучы, што шмат у чым патрэбны перамены, каб палепшало народнае жыцьцё,—заступаліся за ўсіх прыгнечэных. Але і яны неяк забываліся аб тым, што беларускі народ гэта адзін з найболей прыгнечэных і пакрыўджэных,—з якога бы боку на яго не глянуць, мала на яго звертали увагі.

Жадаючы перамен у народным жыцьці, дзеля каторых шмат яно палепшало-бы, жадаючы гэтаго для ўсіх ресейскіх грамадзян, само сабой яны не выключалі адгэтуль і беларусоў. Гаротная доля нашаго селяніна не магла ня кінуцца ім у вочы і расейскіе пісьменнікі нераз малевалі яе у сваіх творах. З гэтаго боку мы на расейскае грамадзянства жаліцца немаем што. Але аб тым, што у беларусоў ёсць такжэ і нацыянальные патрэбы, што для таго каб глыбей і шырэй пранікла культура у народную массу у вусіх школах вучыць трэба па беларуску і агулам завясьці у вусіх установах (інстытуціях) нашаго краю родную народу мову, аб гэтым паступовые расейцы неяк зусім мала гаварылі. Гарача баронючы нацыянальных правоў тых жывушчых у Расеі народоў, каторые самі за іх змагаліся, лепшые расейскіе людзі аб нас мала гаварылі, дзеля таго, што і самі мы сваіх нацыянальных правоў не баранілі, а ім са стараны мала было і відаць, ці нам што гэткае трэба ці мо і не. Усё-ж такі, некаторые выдатные расейцы што пісалі аб Беларусі навуковые працы, лепей пазнаўшы пры гэтым наш край і яго патрэбы, зусім ясна і цьвёрда высказалі думку, што беларусы —гэта аддзельны народ. Аб гэтым пісалі: знаменіты расейскі гісторык Пыпін, этнограф Безсонов і інш. Пісалі яны шмат часу перад тым, як пачалося беларускае нацыянальнае адраджэньне, і тым большае значэньне маюць іх словы.

Цяпер, калі ня толькі асобные людзі а і беларуская народная масса памаленьку пачынае рабіцца нацыянальна сьвядомай, усё гэта зусім перэмянілося.

Нацыяналісты, і усе, хто з імі, многа пішуць аб Беларусах, шкада толькі што страшэнна мала там праўды, сумленнасці, логікі, а ўсё найболей брэхня, выдумкі, даносы, лаянка;—чаго толькі яны аб нас не пісалі, якой напрасліны не ўзвалівалі; ніякіх уступак і палягчэньнёў ня хочуць яны нам даць, а усё выступаюць супроціў.

Іначэй цяпер адносіцца да нас і паступовая Расея Цяпер, калі мы змагаемся за сваё нацыянальнае права, то не мінуюча трэба даць і ім нейкі адказ: ці прызнаць гэтые дамаганьня справядлівымі, ці не. Вось тут мы можэм сказаць, што дайжэ ўся паступовая Расея за нас. У 3-ай і 4-ай Думе паступовые дэпутаты выступалі ад імені сваіх фракцій с прамовамі, у каторых баранілі правоў другіх народоў,—успаміналі нас кажучы, што наша мова павінна мець такіе-ж правы, як і ўсе іншые. Час ад часу заступаюцца за нас у сваіх стацьцях публіцысты. «Беларускі Навукова-Літэратурны Гурток Студэнтоў Пецярбурск. Унівэрс.» сустрэціў дужа прыхільнае аднашэньне са стараны прафэсароў, некаторые пры гэтым болей абшырна выказалі свае думкі аб беларушчыне, праміж іншымі прыхільна да нашаго народу адносяцца такіе выдатные вучоные, як Шахматов, Овсяніко-Куліковскій, Карскій і др. Але ўсёж такі нельга змоўчыць і таго, што зусім мала пішуць аб нас расейскіе паступовые газэты і часопісі, рэдка калі баронюць нас Гэта тым болей прыметна, што нацыяналісты і ўселякіе іх сябрукі, наадварот, надта многа увагі звертаюць Калі паступоўцы прызнаюць справядлівасць нашых дамаганьнёў, то часьцей павінна-б былі гаварыць аб нас.

Якбы там не было, але надта добра і тое, што сымпаціі гэтай стараны з намі, а не з нашымі супраціўнікамі. Гэта мае для нас вялікае моральнае значэньне, і мы заўсёды можэм сказаць адказываючы на пытаньня, хто у расейскім грамадзянстві з намі, а хто супроціў нас. **Лявон Гмырак.**

**Ад Рдакціі:** Аб тым хто пры нас з другіх суседніх народоў, будзе у чародных нумэрах.

## З вясковаго жыцьця.

Калі я вяррнуўся у сваю вёску і пачуў сваю родную мову, калі мяне сустрэцілі з ласкавым прыветам мае суседзі і прыходзілі у маю нізенькую хатку паслухаць маей гутаркі,—маё сэрцэ нязмерна тады цешылося! Але што дальш я прыглядаўся у вясковае жыцьцё, чым больш я з імі гукаў, то мая радасць міналася, а сэрцэ пачынало сумнець.

Дагэтуль я блукаўся па сьвеці. Нагледзіўся многа чаго такога у сьвеці, што дома не пабачыўбы. Перэняў і спазнаў многа чаго, што дома і ня сьніў бы, і ўсім гэтым хацеў падзяліцца я са сваімі суседзямі. Пачаў я ім апаведаць праўду, чыстую праўду, на роднай беларускай мове, каб яны маглі усё тое уцяміць, што я ім казаў Спачатку яны мяне трохі слухалі, калі я ім правіў як людзі жывуць у чужых, далёкіх старонках, але калі мая бяседа даходзіла да таго, што і у нас можна было б гэтак жыць, што мы самі у гэтым вінаваты, што не жывём гэтак, што мы самі топчэм пад ногі тую культуру і прасьвету якую у другіх краёх падымаюць,

І вы, Добрые Гадочкі,
Вечнай праўды стража,
Станьця бліжэй тут ў радочкі;
Ніхай кожны скажэ,
Ці зьвелася, ці пануе
Аб вас памяць ў сьвеці,
Як кахае, як шануе
Вас патомства—дзеці.—
Так сказаў Стары, і Годы,
Добрые і злые,
Стрэпянуліcь, як ў нягоду
Лісьце маладые.
Годы з напісам чырвоным
Ўраз асобна сталі,
Множствам страшным, нешчслёным
Пушчу запоўнялі.
І іх напісы гарэлі
Слупам агнявістым,
І ў ім неба чырванело,
Пушча с снегам чыстым.
Годы Добрые нясьметна
Сталі ўсе па чыну
Цьмяна, бледна, чуць прыметна,
Зьліўшыся ў раўніну.
І вызодзіць цень бязшумна
Справа дакладае:
—Я напоўніў людзям гумны,
Я—Год Ураджая.

Людзі трохі падабрелі,
Ураджай хвалілі,
Потым хлеб мой весь паелі
І мяне забылі.
Паліняла і звелася
Памяць між народа —
Так сказаўшы, адышлася
Цень Ўроджая—Года.
—А я голадам вядомы,
Я—Год галадоўлі:
Я спустошыў людзям домы,
Гумны, ўсе будоўлі.
Мерлі людзі і жывёла,
Як затруты мухі;
Счысьціў я ім ўсё да гола,
Нарабіў разрухі,
А мяне дагэтуль людзі
Часта ўспамінаюць;
Так было і гэтак будзе —
Зла не забываюць.

Так сказала цень с крывавым,
Агнявістым знакам.
—Я быў Згодай, быў ласкавым,
Разсыпаўся макам,
Каб ўсе людзі жылі ў згодзі,
Згода панавала,
Быў парадак, лад ў народзі,
Царствы сябравалі.

А прайшоў мой час,—як сьмеце,
Знішчылась і памяць.
Ці я быў ці не на сьвеці,
Нават і не ўцямяць.—
—Я прынёс раздор народу,
Здраду, меч, пажары,
Я забраў яго свабоду,
Я—Год Помсты, Кары;
Я растрос зямлю да званьня,
Я быў год нешчасны,
Аба мне ж апаведаньня
Сьвежы, чоткі ясны.—
—А я сеяў свет і знаньне.
Праўды разуменьня.
Волі, роўнасьці жаданьня;
Я—Год Прасвятленьння.
І мой сьвет гарыць і зьяе,
Сэрцэ людзям грэе;
Аба мне слух не ўмірае,
Памяць пламянее —
—А я кідаў змрок ў народзі,
Зацемняў галовы...—
—Сьціхні, голас Часоў! годзі!—
Крыкнуў Год тут Новы,
І ўсё змоўкла, ціха стала,
Цені ўсе застылі,
Толькі пушча задрыжала,
Хвоі ўзгаманілі.

І Стары Год стаўся ценям
Поўнач падступала
І жывое ўсё стварэньне
Радасьцю вітало.

—Цені, згіньця! Я ўладарны
Гаспадар над вамі —
Мой настаў час!—Цені марна
Зчэзлі між камлямі.

Змоўкла пушча, сьціхла бура.
Зоры замігалі.
І земля і лес пануры
Новы Год віталі.

І ўсё поглядам пытае
Маладога Года:
Што нясе нам, чым спаткае
Новая прыгода?“

**Якуб Колас.**

*Дзьвінск 31/XII 13 г.*

то яны гэта ніяк не маглі уцяміць і прызнаць сябе вінаватымі у гэтым. Пачалі самной спрэчацца і, трэба прызнаць, часта спрэчаліся справядліва, выстаўляючы такіе прычыны, каторые ня з іх віны дзеюцца і шкодзюць развіцьцю культуры і прасьветы.

Не вялікая вёсачка П., дзе я жыву, ляжыць усяго на чатыры вярсты ад вагзалу, Парафіянава, (Палескай чугункі) — здаецпа не саўсім глухае мейсцо, а прыклад у ей нейкі саўсім дзікі. Праўда, што ня можна сказаць пра ўсіх. бо ёсць адзін гаспадар што нават выпісывае газэту «Сельскій Вѣстрикъ», і калі ён прынясе яе с почты і чытае, то колькі чэлавек прыходзіць слухаць, але болей такіх ёсць што німаюць аніякай ахвоты да гэтвго, а лепей засеўшы дзе, у карты рэжуць; і цяперэшніе доўгіе вечары нашы гаспадары праводзюць без перэстанау за картамі.

Гуляюць у ваза, у шесцьдзесят шэсць, а часам і у грашы схватываюцца, а то хоць на сернікі. Гуляюць у карты ня толькі мужчыны і хлопцы, але часам і дзеўчаты, а што горш усяго, то тое што гуляюць такіе, каторые павінны вучыцца. Ды і як ешчэ павыэдуковываліся, што і старэйшым не паддаюцца! У кожнаго у кішані ёсць колькі пачкоў сернікоў, а калі каторы прагуляепь, то крадзець у гаспадыні яйкі, або і якую кашулю і як прыдзе жыдрызнік у вёску, купляе сабе сернікі для гульні. А як часта здараецца у гэткіх гулякоў спрэчка і нават бойка! Ракумеецца, што тут ужо меншым і слабейшым болей пападае. Гэта і ёсць часць таго нешчасьця нашай вёскі дзеля катораго у яе ня магуць пранікнуць прамені асьветы. Чэлавеча натура так устроена, як тое дрэўцо, што узышоўшы пачне расьці. Калі тое дрэўца садоўнік прышчэпіць добрай розачкай, і будзе дагледаць каб яно у добрым парадку расло, то яно дасць яку скора многа добрых яблыкоў і будзе карысць сабе і людзям. А калі тое дрэўца будзе само сабой расці як захочэ, то пэўне яно узрасьце дзірмазаватае і з горкімі яблыкамі.

Душа малога, калі ён пачынае развівацца і прыходзіць да розуму надта склонна да ўсяго. Тут малое перэймае і прывыкае да таго ладу і тэй натуры і пачуцьцёў, сярод якіх яно будзе гадавацца. А з развіцьцем жыцьця і розуму, усё тое, што малое відзіць і чуець укараняцца у яго сэрца і з ростам чэловека тая спасобнасць склоннасць будзе разрастацца і праяўляцца што раз больш і больш.

Отжэ: калі бацькі пазваляюць сваім дзецям гуляць у карты на сернікі, то пэўна пасьле яны будуць гуляць і на грошы. А у суседняй вёсцы Ц, што развярнулася ва хутары, ёсць назначэны вучастак пад вучылішча, хаця яно ешчэ і не пачыиало будавацца, але у вёсцы ёсць вучыцель і вучыць дзяцей і у нашу вёску наказываў каб прысылалі вучыцца ды ніхто і ня думаў. — Гэта, кажуць, вучыцель не казённы, а наёмны і яму трэба плаціць 15 руб у месяц. Ждуць казённаго, а тым часам дзеці вучацца у карты гуляць.

Аб дзеўчатах то ўжо і казаць німа чаго, бо у нас спрадвеку такая мода, што дзеўкам і кабетам не патрэбна эдукацiя. Яны павінны вучыцца толькі прасьці кудзелю. А ёсць на сьвеці такіе старонкі дзе на гэта пазіраюць інакш, дзе дзеўчаты павінны канечна вучыцца, бо іх чэкае важнае павіннасць у жыцьці — быць маткай. А толькі тая кабета можэ добра споўніць свой абавязак і выгадаваць добрых дзьцей, катораб будзе эдукована, бо яна с чытаньня будзе ведаць як і дзе людзі жывуць і як і дзеля чаго трэба жыць. Эдукованая маці пэўна ад малых дзён пачне і дзяцеў вучыць.

Нашы бацькі такжэ вучуць, бо як толькі малое пачне прыходзіць да розуму і гаварыць, то маці кажэ: — «дай тату куку, во так, во! Ол малайчына мой сынок!» А бацька цешыцца з гэтаго і вучыць так сама:—«скажы мамі тоя і тоя;»— або: „дай ей палкай па лысіне“. І вот з гэтых дзяцей можна спадзевацца ужо чаго добраго.

Хацеў я замяніць гульню у карты чытаньнем газэт, але гэта зрабіць трудней чым я спадзеваўся. Праўда, калі я дастану колькі нумяроў «Нашай Нівы» і стану чытаць, то гэту газэту слухаюць усе з увагай, кажуць што гэта добра што усё па нашаму друкуецца, што усё так панятна, і многа чаго цікаваго ёсць, а калі я стаў раіць выпісаць гэту газэту, то ад неківаюцца што ніхто няўмее чытаць. Шкода суседцы што вы і самі ня ўмееця карыстаць з дарогаго часу і сваім дзецям не пазваляеця.

**Н. Аўрэйцэвіч**

## Да беларусоў у чужой старонцы.

Ужо мінуло безмала восем гадоў працы над адраджэньнем беларусоў да культурнаго жыцьця, а як пабачыш кругом сябе то і падумаеш чяму гэтак дзеецца на сьвеці, што людзі дзеля пустой ляхвы, хоць і ведаюць добра што яны косць с косьці і кроў с крыві беларусы, але ня хочуць прызнацца да свайго народу, звычаю і мовы. Можэ дзеля таго, што другога сваякі ды бацькі надта цёмные людзі? Дык ніхайжэ ведае гэткі беларус, што ён цямнейшы і глупейшы ад усіх іх разам узятых, калі ён будучы беларусам пэрэкідаецца у палякі або маскоўцы. Дзе ж твой розум дзеўся, браце Беларусе?

Няўжож ты аставіў у тым бурносе, або сьвітцы каторую табе маці с сястрою зрабілі з воўны тых авечак, каторых ты пасьвіў.— і каторую табе пашыў кравец Максім твой дзядзька. Цяпер змяніўшы бурнос на чорную опратку, ты забыўся што астаўся беларусам, або калі заехаў вёрстоў колькі паза сваю вёску, то і ня хочэш пабываць у тым кутку дзе ты гадаваўся? Ой заглянь у сваё сэрцэ, а яно заўсёды думае а сваей старонцы. Можэ табе так злажылося, што ня можэш адведапь сваей Маці Беларусі, але ведай што яна цябе чэкае Не забывай і не кажы, што забыўся тэй гутаркі на каторай навучыўся гаварыць першые словы. І не гавары, што дзе пасяліўся там трэба гаварыць тэй гутаркай якая там прынята, а сваю родную трэба забыць. Праўда, трэба вучыцца і прывыкаць да тэй мовы якой гаворуць твае таварышы па службе, бо яны цябе могуць не зразумець, але пасьля службы, як прыйдзеш да сваей хаты, сустрэчайся с такімiж самымі як ты беларусамі, гавары беларускай мовай. Паглядзі на другіе народы: на жыдоў, на палякоў, на маскалёў, на літвіноў і інш., ці яны стыдаюцца сваей роднай мовы? Не, яны не дайшлі да такога малога розуму каб стыдацца сваей бацькоўскай мовы. Апамятайцеся, браточкі, і не забывайцеся сваей роднай мовы і ці вы ідзіцé ці едзеця, гаварыця сваею бацькоўскаю моваю.

**Пранціш з над Невы**

## З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны.

**Юбілей літоўскаго паэты.**

У гэтым гаду прыпадае 25 летняя гадаўшчына літоўскаго паэты ксендза Мацулевіча, цяперэшняго рэктара духоўнай сэмінарыі у Коўні. Пісаў ён пад псэўдонімам Марьёніс, паэзіі яго адзначаюцца дужа пекнай лірыкай і любоўю да роднай Літвы. С паміж літоўскіх сучасных паэтоў Марьёніс найбольш вядомы, шмат яго вершыкоў перайшло у народ і сталіся улюбленымі народнымі сьпевамі.

**Прадажа селянскай зямлі.**

Селянскі банк выставіў на продаж больш 40 участкоў селянскай зямлі купленай пры помачы банку у паветах віленскім, вілейскім, дзісенскім, лідзкім, ашмянскім сьвенцянскім і троцкім, за не аплату у пару ратовак.

**Замёрзшый.**

Каля вёскі Мілекайце на палявой дарозі знайшлі 80 гадоваго старца Захаровіча, каторы ня здужаў дайсці да вёскі у часе марозу і замёрз у сьнягу.

Аколіца **Давідоўшчына** Солечніцкай воласці. Віленскаго пав.

Жывуць тут беларусы-каталікі, каторые, дзякуючы шалёнай полонізацыі, стыдаюцца гаварыць па беларуску, а з лёгкай рукі спэціальнай правіцельственнай палітыкі у нашым краю, дайшлі у сваём экономічным і духоўным жыцьці да „мерзости запустѣнія“.

Зямлі у гаспадароў мала і тая дужа запушчэна. Шахаўніца была страшэнная: у чэлавека 5 дзесяцін зямелькі у 40 кавалках неправільнай формы і раскіданыя далёка кругом аколіцы! Цяпер шахаўніцы німа, але за тое шляхціцу Марыноўскаму замест пяцёх дзесяцін, што меў раней, надзялілі тры дзесяціны, с каторых блізка дзесяціны няўдобы (лог пад каменем і каменны пакат з гары). Калі ехаць па давідоўскаму полю, у вочы кідаецца вялікі шмат кустоў ядлоўца, каменьнёў, дзірваноў. І гэта пры малазямельлі! А мейсцэ прыгожае, — лажчынкі, курганкі, ляскі, зарасьлі рэчка... І клімат здаровы і прыемны.

Аколіца у 12 вярстох ат станціі зялезнай дарогі, цэны на ўсё як ня віленскіе. Масла 55 к. фунт, яйкі—35 кап. дзесятак, але тутэйшые гаспадары спяць і сонца не бачуць: гадуюць такіх каровак, што пад вясну не ўстаюць і іх прыходзіцца паднімаць на вяроўках

Сялібкі дрэнные. Лясы ёсць у некаторых, але і ў тых хаты сьцюдзёны і грязны, па старынцы, а не па тэй маламожнасці, кожда з іх «і цячэ і гніе, і крывая»... У сенцах бульба, куры, буракі. Вакенцы невялічкіе, шыбкі найболей пабіты і заместа іх — анучы

У хаці ня чыста. Клапоў, прусоў, блох і ўсякіх другіх кур'ероў не

## САКПІЎ.

Старшыня у карчме, пісар тут ля яго!
Пьюць, гуляюць,—сягоньня Пакровы,
А у вёску хтось прэ; ды з разгону ўсяго,
Бо аж енчыць званочэк пачтовы.

Старшыне мужыкі кажуць: дохтар да нас
Пэўне ў воласць, ці што, паркай едзе;
Трэба выйсці спаткаць. А старшыню якраз
Разабрала—на лаве ня ўседзе.

Пісар зноў так цадпіў, што ужо ракам паўзе,
Вачмі лыпае, носам таўчэцца.
Доктар воласць мінуў, фурман проста вязе;
У мястэчка, відаць, кудысь прэцца.

Як пачуў старшыня—(бо сказалі яму),
Што вунь дохтар пачтовымі чэшэ,—
Яго кажэ зазваць; у карчму да сябе
Мужыкоў абецанкаю цешэ:

„Самі будзеце чуць, як сакплю я з яго,—
Ен жэ дохтар — ніхай жэ пазнае;
Ен навукі прайшоў, лечэ нас ад ўсяго,—
Для мяне хай лекарства згадае“.

Дохтар тыц, увайшоў. Старшыня прывітаў,
Але гэтак быў пьяны бяз меры,
Што каб дохтара ў міг сам за карк не абняў,
Дык патыліцай рэзнуў бы ў дзьверы.

Ўсёж разону свайго ён ні траце пры тым,
Кажэ: пане, згадай што такое:
Праўды я не кажу, смак ня чую зусім;
Хай пан вылечэ, жарты нястрое.

Сьмела бью аб заклад, што ні пану пазнаць;
Закладайся і пан будзеш бачыць;
Калі праўду пачуць, або смак распазнаць
Пану ўдасца—дык што тут тлумачыць!..

Грошы ўсе забярэш, а прайграеш — мае
Бачэ доктар—той кпіць з яго хочэ,—
Кажэ: добра, чэкай, ты пазнаеш мяне.
Бярэ пляшкі таўчэ штось і мочэ.

После вышаў на двор, ды у слоік малы
Набраў дзёгцю с сваей каламажкі
Нясе ў хату крыху падмешаўшы смалы
І пархумы каб дух ні быў цяжкі.

Кажэ: ну, старшыня, на услоні прысядзь,
Язык высалап доўга да пупа,—
Мушу сэрцэ тваё і твой пульс паверацъ,
А у горле прыгледзіцца струпа.

Старшыня смела сеў. А сам пэўны сябе.
Буду лгаць, дык ткі трасцу спазнае;
Ненапісана ж бач, каб чытаць мог на лбе.
Гэта мысьліць і рот разяўляе.

Ні то спраўды ці што дохтар шчупае ўсяк,
Дудкай слухае грудзі і спіну,
З ваты ў горла упхаў нібы кнот спорны клак,
Язык выцер і вымачаў сліню.

І пасьля ўжо таго зграбна лыжычкай ўзяў
Таей мазі і торкнуў у зубы.
Як ужалены быц, старшыня закрычаў
Ды бардзей сашчаміў свае зубы.

Што мне пане, даеш? гэта-ж дзёгцям смярдзіць!
Палыкаць гэту дрэнь я нябуду
А народ у карчме за фацэцяй слядзіць,
Дохтар просе у іх тады суду.

Кажэ: чуеце ўсе: старшыня смак пазнаў, —
Во як сам ён агледзіўся скора, —
Праўда, дзёгаць тут, і тут ён не салгаў
І усім нам во праўду гаворэ.

І пад то грошы згроб. Гэта, кажэ, маё!
Мусе знаць перш з кім так закладацца.
Мужыкі га, га, га. Давай жарты свае
Утыкаць і над дурнем смеяццца.

**Альбэрт Паўловіч.**

